## III МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «ПИСАТЕЛЬ – ЯЗЫК – СТИЛЬ», 21–22 СЕНТЯБРЯ 2023 г.

## III МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ПІСЬМЕННІК – МОВА – СТЫЛЬ», 21–22 ВЕРАСНЯ 2023 г.

## 3rd INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «WRITER – LANGUAGE – STYLE», 21–22 SEPTEMBER 2023

«Пісьменнік – мова – стыль» – такую назву мае міжнародная навуковая канферэнцыя, якая рэгулярна праводзіцца на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Упершыню яна адбылася 17–19 верасня 1996 г. і была прымеркавана да 70-гадовага юбілею вядомага мовазнаўца, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесара Л. М. Шакуна. Па аб'ектыўных прычынах пазней у правядзенні канферэнцыі быў зроблены перапынак, аднак закладзеная ў яе аснову ідэя стварэння для філолагаў магчымасці распавесці пра ўласныя навуковыя даследаванні мовы тэкстаў розных аўтараў, стыляў і жанраў, а таксама даведацца пра актуальную дзейнасць калег спрыяла ўзнаўленню канферэнцыі як традыцыйнага навуковага мерапрыемства. Дарэчы, удалы вопыт правядзення канферэнцыі «Пісьменнік – мова – стыль» у 1996 і 2001 гг., у якой удзельнічалі спецыялісты не толькі з розных рэгіёнаў Беларусі, але і з Аўстрыі, Венгрыі, Германіі, Польшчы, Расіі і Украіны, паспрыяў зараджэнню новай міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мова – літаратура – культура» з больш шырокай праблематыкай і тэматыкай. Яна таксама стала традыцыйнай і ўжо другое дзесяцігоддзе праходзіць на філалагічным факультэце БДУ.

Кафедра беларускага мовазнаўства арганізавала і правяла III Міжнародную навуковую канферэнцыю «Пісьменнік – мова – стыль» 21–22 верасня 2023 г. Гэтым разам мерапрыемства было прысвечана першаму дэкану філалагічнага факультэта БДУ вядомаму рускаму і беларускаму навукоўцу Ц. П. Ломцеву. Ён быў дэканам непрацяглы даваенны час – з 1939 па 1941 г., але яшчэ з 1934 г. працаваў у БДУ на пасадзе прафесара, а пазней, з 1943 г., быў загадчыкам кафедры рускай мовы ў эвакуіраваным універсітэце на станцыі Сходня Маскоўскай вобласці. Ц. П. Ломцеў з'яўляецца аўтарам 16 манаграфій і каля 140 прац па рускай і беларускай мовах, таму навуковая спадчына лінгвіста прыцягвае ўвагу не толькі расійскіх, але і беларускіх мовазнаўцаў.

Праца канферэнцыі пачалася з урачыстага адкрыцця, падчас якога да прысутных з прывітальнымі словамі звярнуліся дэкан філалагічнага факультэта дацэнт С. А. Важнік і загадчык кафедры рускай мовы, старшыня Беларускага грамадскага

CC BY NC

аб'яднання выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры, член прэзідыума Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры, прафесар І. С. Роўда.

Першы даклад на пленарным пасяджэнні, зроблены загадчыкам кафедры беларускага мовазнаўства прафесарам М. Р. Прыгодзічам, пазнаёміў прысутных з дзейнасцю Ц. П. Ломцева і яго асноўнымі працамі па беларускай мове. Прафесар М. І. Канюшкевіч распавяла пра вынікі і перспектывы рэалізацыі міжнароднага праекта М. У. Усеваладавай «Граматыка славянскага прыназоўніка», якія з'яўляецца працягам развіцця ідэй, выказаных навуковым кіраўніком яе кандыдацкай дысертацыі Ц. П. Ломцевым. Пра словатворчасць П. Панчанкі гаварыў у сваім дакладзе, напісаным у суаўтарстве з дацэнтам Б. А. Крукам, дацэнт А. В. Солахаў (Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна). Аспекты канцэптуалізацыі нацыянальнай літаратурнай мовы беларускімі і славацкімі пісьменнікамі асвятляліся ў выступленні прафесара Універсітэта Мацея Бела В. М. Ляшук (Банска-Быстрыца, Славакія).

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі падалі 72 чалавекі; 64 даклады, за выключэннем пленарных, былі размеркаваны па пяці секцыях, што працавалі на працягу двух дзён. Секцыя «Актуальныя праблемы мовазнаўства» стала найбольш прадстаўнічай па колькасці ўдзельнікаў, якія заявілі 22 даклады, прысвечаныя розным праблемам беларускай тэрміналогіі (Г. І. Кулеш, А. М. Лапцёнак, А. Я. Супрыновіч і інш.), анамастыкі (І. А. Гапоненка), функцыянальнай стылістыкі (П. С. Басалыга, Д. Г. Марчанка і інш.), гісторыі беларускага мовазнаўства (С. М. Запрудскі, І. І. Караткевіч), а таксама моўным асаблівасцям асобных тэкстаў (У. І. Куліковіч). Зразумела, што канферэнцыя «Пісьменнік – мова – стыль» прыцягвае ўвагу тых філолагаў, якія займаюцца даследаваннем мовы твораў празаікаў ці паэтаў. На секцыі «Мова мастацкай літаратуры» былі прадстаўлены 9 такіх дакладаў. Яны датычыліся творчасці Янкі Купалы (А. Я. Мантур), Якуба Коласа (Ю. В. Назаранка), Максіма Гарэцкага (Ю. А. Гурыновіч), Давіда Самойлава (І. С. Балабановіч), Уладзіслава Галубка (Л. У. Глушыцкі) і Міколы Шабовіча (Н. У. Чарнаброўкіна). Большасць дакладаў, агучаных на секцыі «Гісторыя мовы», былі прысвечаны пытанням гістарычнага сінтаксісу (І. У. Будзько, С. М. Макітрук, В. К. Мароз, Н. В. Паляшчук, Э. В. Ярмоленка), што сведчыць пра актыўную распрацоўку дадзенага напрамку гістарычнага мовазнаўства. Удзельнікі секцыі пачулі таксама выступленні на тэмы функцыянавання малавядомых тэкстаў XVIII ст. (М. І. Свістунова) і адаптацыі старабеларускіх германізмаў (В. У. Пахірка). Усяго на гэтай секцыі выступілі 7 даследчыкаў. Творчасці асобных пісьменнікаў (Максіма Багдановіча, Паўлюка Труса, Рыгора Семашкевіча, Соф'і Шах, Ладзіслава Фукса, Чэслава Мілаша і інш.), беларускай жаночай паэзіі XX ст., усходніх форм сучаснай рускай паэзіі, некаторых аспектаў вывучэння старажытных літаратурных помнікаў (А. І. Бельскі, А. У. Вострыкава, У. Г. Кароткі, А. Я. Сьянава і інш.), асобных фальклорных жанраў, а таксама праблем кампаратывістыкі і параўнальна-тыпалагічнага літаратуразнаўства датычыліся 16 дакладаў, заяўленых на секцыі «Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка. Культуралогія». Удзельнікі секцыі «Методыка выкладання філалагічных дысцыплін» былі засяроджаны на розных пытаннях выкладання беларускай і рускай моў інафонам, навучання міжкультурнай камунікацыі, фарміравання кампетэнтнаснага падыходу і лінгвакультуразнаўчай кампетэнцыі (Т. А. Савіна, С. М. Якуба і інш.).

Па выніках правядзення III Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Пісьменнік – мова – стыль» запланаваны выпуск друкаванага зборніка навуковых матэрыялаў. У хуткім часе з артыкуламі ўдзельнікаў мерапрыемства можна будзе пазнаёміцца як у папяровым выданні, так і ў электроннай бібліятэцы БДУ.

***М. І. Свістунова***[1]

[1]*Марина Иосифовна Свистунова* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Марына Іосіфаўна Свістунова* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Maryna I. Svistunova*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *svistunovami@bsu.by*